ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ПРАЦОЎНАЙ МІГРАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

ІРЫНА ВАШКО

Анатацыя: У дадзеным артыкуле разгледжаны тэндэнцыі развіцця працоўнай міграцыі ў Беларусі і яе магчымае эканамічнае ўздзеянне на нацыянальную эканоміку. Вызначаны фактары, якія ўплываюць на міграцыйныя працэсы ў краіне.

Ключавыя словы: працоўная міграцыя, тэндэнцыі, фактары міграцыі.

TRENDS IN THE LABOUR MIGRATION DEVELOPMENT IN THE REPUBLIC OF BELARUS

Abstract: This study seeks tendencies of the development of labour migration in the Republic of Belarus and its possible economic impact on the national economy. The factors which have an influence on the migration processes in the country are identified.

Keywords: Labour Migration, Trends, Factors of Migration.

Міжнародная працоўная міграцыя рабочай сілы, з аднаго боку, з'яўляецца фактарам, які ўздзейнічае на працэсы глабальнага развіцця, з другога боку, абумоўліваецца названымі працэсамі.

Пад міграцыяй разумеецца незваротнае, часовае, а таксама сезоннае перасоўванне фізічных асоб з дзяржавы і ў дзяржаву, а таксама перасяленне фізічных асоб унутры дзяржавы, звязанае са зменай месца жыхарства, працы.

Працоўная міграцыя ўяўляе сабой міграцыю фізічных асоб з адной краіны ў іншую з мэтай найму на працу. Працоўная міграцыя характарызуецца добраахвотнасцю, і яе мэтай з'яўляецца працоўная дзейнасць.

Адрозненні ва ўзроўнях заработнай платы ў развітых краінах і краінах з невысокім узроўнем эканамічнага развіцця вельмі значныя ў параўнанні з адрозненнямі ў кошце тавараў або капіталу, таму міграцыя рабочай сілы можа прывесці да значных эканамічных зменаў. Дадзеныя тэндэнцыі варта ўлічваць і ў Рэспубліцы Беларусь.

Колькасць замежных работнікаў у Рэспубліцы Беларусь у папярэднія гады была нязначная, але яна ўзрасла за кошт прытоку ўкраінскіх працоўных мігрантаў. Пераважнымі сферамі занятасці працоўных мігрантаў з'яўляюцца: будаўніцтва, гандаль, камунальныя паслугі, сельская гаспадарка.

У той жа час міграцыйная прывабнасць Беларусі павысілася для кітайскіх працоўных мігрантаў за кошт фарміравання спрыяльнага інвестыцыйнага клімату ў краіне і планаванай рэалізацыі шэрагу кітайскіх інвестыцыйных праектаў.

Паводле дадзеных Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, размеркаванне працоўных-мігрантаў, якія ўехалі ў Рэспубліку Беларусь у студзені-снежні 2014 года (32.288 чалавек), па родзе дзейнасці было наступным:

Кіраўнікі – 1240 чалавек;

Кваліфікаваныя работнікі і спецыялісты – 4260 чалавек;

Работнікі сферы абслугоўвання, гандлю – 1577 чалавек;

Работнікі, занятыя ў сельскай гаспадарцы – 2361 чалавек;

Рабочыя спецыяльнасці – 22.850 чалавек;

З іх: мужчын – 27.503 чалавекі; жанчын – 4785 чалавек (Министерство внутренних дел, 2015).

Попыт на работнікаў у мінулыя гады ў Беларусі ў асноўным быў прадстаўлены ў наступных відах эканамічнай дзейнасці: апрацоўчая прамысловасць; будаўніцтва; сельская гаспадарка, паляванне і лясная гаспадарка; гандаль, рамонт аўтамабіляў, бытавых вырабаў, прадметаў асабістага карыстання; транспарт і сувязь; аперацыі з нерухомай маёмасцю, арэнда і аказанне паслуг спажыўцам; ахова здароўя і аказанне сацыяльных паслуг.

У Беларусі забяспечваецца жорсткі міграцыйны кантроль, які абмяжоўвае магчымасці нелегальнай міграцыі ў краіну, тым не менш адкрытасць межаў з Расіяй, адсутнасць пагранічнага кантролю стварае дадатковыя магчымасці для ўезду нелегальных мігрантаў і выезду беларускіх працоўных мігрантаў.

Ва ўмовах развіцця інтэграцыйных працэсаў на міжкраінавым узроўні на дадзеным этапе эканамічнага развіцця краіны выштурхоўваючыя фактары для працоўных мігрантаў у Беларусі з'яўляюцца вельмі значнымі. Уздзеянне знешніх і ўнутраных сацыяльна-эканамічных фактараў прывяло да росту плыні працоўных мігрантаў у Расію, на дадзеным этапе яго некаторае зніжэнне звязана з крызіснымі з'явамі ў расійскай эканоміцы. Паводле інфармацыі Федэральнай міграцыйнай службы Расійскай Федэрацыі, агульная колькасць беларускіх грамадзян, якія знаходзіліся на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі (па стане на 27 жніўня 2015 года), склала 607.050 чалавек, з іх: мужчын – 344.435 чалавек; жанчын – 262.615 чалавек (Федеральная миграционная служба, 2015).

Частка насельніцтва Беларусі выкарыстоўвае магчымасці для легальнай і нелегальнай працоўнай міграцыі за межамі СНД, пераважна ў еўрапейскіх краінах.

Захоўваюць прывабнасць для беларускіх мігрантаў (пераважна для моладзі – асоб з вышэйшай адукацыяй і веданнем замежных моў) і іншыя краіны далёкага і блізкага замежжа. Візавыя бар'еры ў развітых краінах, якія рэалізуюць міграцыйную палітыку, накіраваную на прыцягненне высокакваліфікаваных мігрантаў і бізнэс-мігрантаў, не з'яўляюцца значнай перашкодай для беларускіх мігрантаў.

У найбліжэйшыя гады прагназуецца рэзкае скарачэнне працоўных рэсурсаў у Беларусі пад уплывам фактараў натуральнага руху насельніцтва, зніжэння яго колькасці. Аднак уздзеянне апошняга эканамічнага крызісу выклікае скарачэнне попыту на працоўныя рэсурсы.

Ва ўмовах актывізацыі эканамічнай дзейнасці ў краіне дэфіцыт працоўных рэсурсаў можа стаць адным са значных фактараў, якія будуць перашкаджаць устойліваму росту нацыянальнай эканомікі, што абумоўлівае значнасць пошуку рэзерваў захавання працоўнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь.

Наступствы працоўнай міграцыі для Беларусі можна разглядаць з пункту гледжання сістэмнага ўздзеяння на краіны-донары і краіны-рэцыпіенты.

На краіну іміграцыі адмоўным уздзеяннем працоўнай міграцыі з'яўляецца: адток кваліфікаваных кадраў, магчымасць актывізацыі інфляцыйных працэсаў пры значнай вазе знешніх трансфераў, магчымы рост сацыяльнай напружанасці. Станоўчае ўздзеянне – памяншэнне ўзроўню беспрацоўя; паслабленне нагрузкі на бюджэт краіны за

кошт сацыяльных трансфераў; трансферы працоўных мігрантаў; магчымасць вяртання ў краіну вопытных кваліфікаваных кадраў.

Уздзеянне міграцыі на краіну эміграцыі наступнае: адмоўнае ўздзеянне – павелічэнне бюджэтнай нагрузкі (у выпадку пастаяннай міграцыі, міграцыі сем'яў); станоўчае ўздзеянне – прыцягненне дадатковых працоўных рэсурсаў; рост аб'ёмаў вытворчасці, сукупных даходаў і сукупнага попыту; ліквідацыя структурных дыспрапорцый на рынку працы; рашэнне праблемы старэння нацыі.

Такім чынам, можна зрабіць высновы.

У Беларусі забяспечваецца жорсткі міграцыйны кантроль, які абмяжоўвае магчымасці нелегальнай міграцыі ў краіну.

Тым не менш адкрытасць межаў з Расіяй, адсутнасць пагранічнага кантролю стварае дадатковыя магчымасці для ўезду нелегальных мігрантаў і выезду беларускіх працоўных мігрантаў.

Частка насельніцтва Беларусі выкарыстоўвае магчымасці для легальнай і нелегальнай працоўнай міграцыі ў Расію і іншыя краіны.

Для беларускіх мігрантаў, пераважна для моладзі, асоб з вышэйшай адукацыяй і веданнем замежных моў, захоўваюць прывабнасць краіны далёкага замежжа.

Развітыя краіны рэалізуюць міграцыйную палітыку, накіраваную на прыцягненне высокакваліфікаваных мігрантаў і бізнэс-мігрантаў, у тым ліку з Беларусі, што стварае магчымасці для адтоку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Візавыя бар'еры не з'яўляюцца значнай перашкодай для беларускіх працоўных мігрантаў.

Развіццё працоўнай міграцыі з'яўляецца працэсам, які дазваляе павысіць эканамічную эфектыўнасць функцыянавання нацыянальнай эканомікі краіны эміграцыі, аказаць станоўчае ўздзеянне на краіну іміграцыі. У той жа час неабходна ўлічваць магчымасці адмоўнага ўздзеяння тэндэнцый развіцця міграцыйных працэсаў на эканоміку Беларусі і сацыяльна-дэмаграфічную структуру.

Бібліяграфія

1. *Министерство внутренних дел Республики Беларусь* (2015). Трудовая миграция, 2014. Минск, URL (доступ 25.09.2015): http://mvd.gov.by/ru/main.aspx?guid=16721.

2. *Федеральная миграционная служба* (2015). Статистика, 2015. Москва, URL (доступ 25.09.2015): http://www.fms.gov.ru/about/statistics/data/details/54891/.